19.10.2015
01-11/Д-545,575

Дзергачову А.М.
amd.bel@gmail.com

Паважаны Аляксандр Мартынавіч!

Вашы электронныя звароты з нагоды недакладнасці звестак Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў (далей — Цэнтральная камісія) адносна колькасці галасоў у падтрымку кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Т.М.Караткевіч па Смаргонскім раёне разгледжаны ў Цэнтральнай камісіі.

У адпаведнасці з артыкуламі 39, 40 і 44 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь абласныя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь устанаўліваюць вынікі галасавання па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па вобласці і паведамляюць пра іх у Цэнтральную камісію. Раённыя камісіі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь устанаўліваюць вынікі галасавання па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па раёне і паведамляюць пра іх у абласную камісію. Участковая камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь праводзіць падлік галасоў і ўстанаўлівае вынікі галасавання па ўчастку. Пратакол пасля ўстанаўлення вынікаў падліку галасоў асабіста старшынёй, або намеснікам старшыні, або сакратаром участковай камісіі прадстаўляецца ў адпаведную раённую камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а таксама ў орган, які ўтварыў камісію, для інфармацыі.

Звесткі пра колькасць галасоў у падтрымку кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Т.М.Караткевіч па Смаргонскім раёне Цэнтральнай камісіяй атрыманы з дакументаў і ў парадку, прадугледжаных Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь.

З інфармацыі, якая змяшчаецца ў Вашым звароце, і фрагментаў светакопій пратаколаў, прыкладзеных да яго, не ўяўляецца магчымым устанавіць недакладнасць названых звестак.

Выбарчае заканадаўства не ўтрымлівае абавязак тэрытарыяльных камісій размяшчаць вынікі галасавання па выбарчых участках. Таксама Вы не маеце права атрымліваць такую інфармацыю як наглядальнік, паколькі вычарпальны пералік правоў наглядальнікаў, які замацаваны ў артыкуле 13 Выбарчага кодэкса, не прадугледжвае такой магчымасці.

Старшыня камісіі Л.М.Ярмошына